# Станаўленне савецкай школьнай вучэбнай літаратуры па грамадазнаўчых прадметах (1920—1930-я гады XX стагоддзя)

**А. Э. Жосан**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры педагогікі, псіхалогіі і карэкцыйнай адукацыі Кіраваградскага абласнога інстытута паслядыпломнай педагагічнай адукацыі імя Васіля Сухамлінскага

**Анатацыя.** *У артыкуле аналізуецца стан і вызначаюцца тэндэнцыі развіцця школьнай вучэбнай літаратуры па грамадазнаўчых прадметах ва Украіне ў 1921—1934 гг. Разглядаюцца асноўныя фактары, якія ўплывалі на стан і функцыянаванне вучэбнай літаратуры.*

**Summary.** *The author has analyzed status of national school educational literature of the social science subjects. He has formulated trends in it 1921—1934 years. The author has researched the main factors that influenced the status and the types of educational literature.*

**Ключавыя словы:** *віды школьнай вучэбнай літаратуры, комплекснае навучанне, вучэбная праграма, вучэбны дапаможнік, падручнік-даведнік, рабочая кніга.*

**Keywords:** *types of school educational literature, the method of comprehensive training, educational program, training manual, reference book, workbook.*

**Уводзіны.** Усебаковае вывучэнне школьнай вучэбнай літаратуры ў кантэксце яе гісторыка-педагагічнага развіцця ва ўзаемасувязі з сучаснасцю і будучыняй патрабуе сістэмнага падыходу. Таму канструктыўна-крытычны аналіз вопыту стварэння розных яе відаў з'яўляецца важнай крыніцай для выпрацоўкі сучаснай стратэгіі канструявання, экспертызы і выкарыстання ў галіне агульнай сярэдняй адукацыі Украіны.

Гісторыка-педагагічны падыход дае магчымасць больш глыбока зразумець заканамернасці паступовага развіцця педагагічных, псіхалагічных, кнігазнаўчых з'яў, іх абумоўленасць сацыяльна-культурнымі, палітычнымі і іншымі фактарамі, выявіць узаемасувязі, аб'ектыўна ацаніць стан і высветліць агульныя тэндэнцыі развіцця з'явы.

Праблемы функцыянавання розных відаў школьнай вучэбнай літаратуры па грамадазнаўчых прадметах ў 20-я — пачатку 30-х гг. XIX ст. вывучалі Л. Бушчык, А. Дзятлава, Л. Іванова, М. Лысенка, А. Памятун, І. Смагін і іншыя. Некаторыя аспекты развіцця школьнай вучэбнай літаратуры разглядаліся ў гісторыка-педагагічных працах айчынных навукоўцаў (Л. Беразіўская, Н. Багданец-Біласкаленка, Н. Кузьменка, У. Ліпіньскі, Л. Патапава, Г. Разлуцкая, Б. Ступарык і інш.).

Праблема навукова-метадычнага забеспячэння функцыянавання ў Украіне ў названы перыяд школьнай вучэбнай літаратуры яшчэ не знайшла належнага адлюстравання ў навуцы. **Мэта артыкула** — спроба вызначыць стан і тэндэнцыі развіцця айчыннай школьнай вучэбнай літаратуры па грамадазнаўчых дысцыплінах у 1921—1934 гг.

**Асноўная частка.** Украінская савецкая мадэль школьнай грамадазнаўчай адукацыі і адпаведная адукацыйная сістэма пачалі ствараццa як інструмент ідэйна-палітычнай адукацыі мас і як сродак фарміравання све-

тапогляду моладзі. З усталяваннем савецкай улады ва Украіне адразу пачалася змена палітыка-ідэалагічных параметраў адукацыйнай сістэмы школьнага грамадазнаўства. Традыцыйныя прадметы (гісторыя, філасофская прапедэўтыка, заканазнаўства, Закон Божы) ужо не адпавядалі новаму зместу грамадазнаўчай адукацыі. У адным з першых распараджэнняў Народнага камісарыята адукацыі УССР у 1919 г. у школах забаранялася выкладанне Закона Божага. У 1919—1920 гг.у школах Савецкай Украіны сярод грамадазнаўчых прадметаў выкладаліся Савецкая Канстытуцыя, палітграмата і гісторыя класавай барацьбы.

У 1920—1923 гг. адбываліся ўдасканаленне і прыстасаванне старых вучэбных праграм і падручнікаў да запатрабаванняў савецкай школы. У гэты час быў сфарміраваны змест і вызначана назва новага інтэграванага школьнага прадмета «Грамадазнаўства».

Тэрмін «грамадазнаўства» ў значэнні назвы школьнага вучэбнага прадмета замацаваўся ў праграме адзінай сямігадовай школы ў 1921 г. Гэта дысцыпліна ўключала ў сябе веды з гісторыі, палітычнай эканоміі і права і была накіравана на вывучэнне сацыяльнай рэчаіснасці і фарміраванне пэўных грамадзянскіх ідэалаў у кантэксце пануючай камуністычнай ідэалогіі. Змест савецкага прадмета «Грамадазнаўства» прадугледжваў неабходнасць размежавання грамадазнаўчай і гістарычнай адукацыі, вынікаў з адрозненняў дзвюх груп грамадскіх навук. *Першую групу* складаюць уласна гістарычныя навукі, якія вывучаюць падзеі мінулага чалавецтва ў іх індывідуальнай праяве і разнастайнасці. Грамадскія навукі *другой групы* вывучаюць сучасную рэчаіснасць пераважна ў абагульненым выглядзе. Першыя, як правіла, даюць «вертыкальны», другія, галоўным чынам, — «гарызантальны» зрэзы развіцця грамадства. Вядучым для першай групы навук з'яўляецца гістарычны падыход да вывучэння грамадства, для другой — лагічны або структурны падыход [12, с. 109].

Да сутнасці і змястоўнага напаўнення вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў тэорыі і практыцы школы пачатку 20-х гг. існавала некалькі падыходаў. Паводле аднаго з іх, гэта асобная навука, комплекс ведаў, неабходных навучэнцам. Аўтары тлумачальнай запіскі да праграмы 1921 г. (М. Тарасаў і інш.) лічылі, што грамадазнаўства як дысцыпліна — гэта сінтэз эканомікі, права і гісторыі [17]. Згодна з іншымі падыходамі (С. Дзюбінскі, Б. Жаваранкаў, С. Сінгалевіч і інш.), — гэта сінтэз некалькіх самастойных навук, у першую чаргу сацыялогіі, складанасць якой для вучняў 7-гадовай школы не дае права ўводзіць яе ў вучэбную праграму [1].

Такім чынам, гісторыя перастала існаваць як самастойны вучэбны прадмет і ўвайшла ў склад грамадазнаўства. Інтэграцыя гісторыі з іншымі грамадазнаўчымі прадметамі ў пачатку 20-х гг. тлумачылася пошукамі новага разумення сутнасці гістарычнага працэсу і ідэалагічна і вучэбнай літаратурай для фарміравання свядомасці грамадзян новай дзяржавы [12, с. 109].

Курс грамадазнаўства будаваўся на аснове сацыялагічнага разумення структуры грамадства. Яго матэрыял быў сканструяваны не храналагічна, як у гісторыі, а тэматычна. Асноўнай мэтай курса, акрамя засваення заканамернасцей развіцця грамадства, вызначалася неабходнасць фарміравання навыкаў навуковай працы для аналізу і даследавання сацыяльнай рэальнасці.

Звесткі пра савецкае права ў курсе грамадазнаўства знаёмілі школьнікаў перш за ўсё з арганізацыяй органаў савецкай улады, іх грамадска-палітычнай роляй, прававымі нормамі ў сферах працы, землекарыстання, дзейнасці прафсаюзаў і г. д. Усё гэта дае падставу вызначыць школьнае грамадазнаўства 20—30-х гг. не толькі як прадмет, але і як напрамак, пункт гледжання, плоскасць у пабудове зместу і працэсу навучання [4, с. 50].

У вучэбнай літаратуры па грамадазнаўстве 1920-х гг. вызначаліся задачы грамадазнаўчай адукацыі, сфармуляваныя ў праграмах. Калі асноўнай мэтай грамадазнаўчых прадметаў у пачатку XX ст. было фарміраванне ў вучняў ведаў на аснове апошніх дасягненняў навукі, то асноўнай мэтай інтэграванага курса ў 1920-х гг. стала набыццё ўменняў і навыкаў аналізу сацыяльнай рэчаіснасці. У тлумачальнай запісцы да вучэбнай праграмы па грамадазнаўстве (1919) адзначалася, што тэмы, аднесеныя да гэтага прадмета, якія складаюцца з элементаў палітычнай эканоміі, права, гісторыі культуры, этнаграфіі, дзяржавазнаўства і тэхнікі, будуць рэалізоўвацца ў працэсе жывых гутарак, экскурсій, у ходзе рашэння практычных задач, якія стаяць перад школай [2, с. 117]. Характэрнымі прыкметамі вучэбных праграм 1921 г. былі: скіраванасць на комплекснасць, вызначэнне гісторыі роднага краю, стрыжань навучальнага працэсу, канцэнтрычны

характар. Народныя камісарыяты як УССР, так і РСФСР лічылі праграмы для школ не абавязковымі. Праўда, гэта не датычылася праграмы па грамадазнаўстве, што адасабляла гэты прадмет і рабіла яго адметным [18, с. 102].

Калі ў 1920 г. грамадазнаўства было прадстаўлена 4 вучэбнымі праграмамі па гісторыі культуры, найноўшай гісторыі, гісторыі сацыялізму і палітычнай эканоміі, то ўжо ў 1921 г. іх аб'яднаді ў адзін дакумент. Асноўнымі недахопамі праграм па грамадазнаўстве С. Раўкін вызначаў іх абстрактна-сацыялагічны схематызм, адсутнасць гістарычнай канкрэтнасці і паслядоўнасці, перанос тагачасных сацыяльна-палітычных і эканамічных паняццяў (капіталізм, імперыялізм) у гісторыю антычнага свету, ігнараванне узроставых асаблівасцей школьнікаў [11, с. 40].

У 1923 г. былі выдадзены педацэнтрычныя праграмы пад назвай «Кіраўніцтва па сацыяльным выхаванні» [7]. У «Кіраўніцтве...» было пазначана, што навучанне павінна ажыццяўляцца не ў інтарэсах таго ці іншага прадмета навучання, а ў тым парадку, які дыктуецца патрабаваннем прыроды «яе вялікасці дзіцяці». Змест грамадазнаўства будаваўся па прынцыпе «ад блізкага да далёкага, ад канкрэтнага да абстрактнага». Грамадазнаўства як вучэбны прадмет утварала сістэму пэўных канцэнтрычна-інфармацыйных колаў: сям'я — школа — сяло — раён — краіна — свет. Таму спачатку вывучалася элементарнае і звыклае, затым больш складанае, далей — больш вялікае і значнае, што неабходна даследаваць. Напрыканцы грамадазнаўства было маштабным: ад класа да класа аб'ём грамадазнаўчага матэрыялу павялічваўся і ўскладняўся. Асноўнымі структурнымі элементамі абавязковага вучэбнага мінімуму па грамадазнаўстве для школы І ступені былі айчынная і сусветная гісторыя, філасофія, палітычная грамата (звесткі пра Савецкую уладу, камуністычную партыю, ідэалагічныя прынцыпы новай дзяржаўнай сістэмы), савецкае права (дзяржаўны лад, структура ўлады), матэрыяльная культура. Вучэбны матэрыял у школе І ступені будаваўся як сістэма канцэнтрычных колаў, дзе большае накладвалася на меншае, пачынаючы ад сям'і і яе бліжэйшага атачэння да жыцця ў краіне і свеце. Першыя два гады навучання вызначаліся прапедэўтычна: вывучаліся і сістэматызаваліся элементарныя назіранні за навакольным асяроддзем. Тэма першага года навучання «Сям'я і школа» была стрыжнёвай. Другі навучальны год прадугледжваў асэнсаванне ведаў, звязаных з жыццём вёскі ці горада. На трэцім годзе навучання пачыналася вывучэнне асноўнага курса грамадазнаўства з паглыбленнем ведаў пра сучасныя грамадскія з'явы на аснове разгляду падзей у родным горадзе (вёсцы).

У 1922—1923 гг. школы Украіны перайшлі на выкладанне грамадазнаўства па праграмах 1921 г. 7-гадовай Адзінай працоўнай школы РСФСР, а з 1923 г. Дзяржвыдат Украіны пачаў друкаваць уласную вучэбную літаратуру па грамадскіх дысцыплінах. Для рэалізацыі комплекснага навучання школьнікаў па новых праграмах з'явіўся адпаведны тып вучэбнага дапаможніка — «падручнік-даведнік», які ў 1925 г. трансфармаваўся ў «рабочую кнігу». Асноўныя патрабаванні да яе ў 1927 г. былі зацверджаны навукова-педагагічнай секцыяй Дзяржаўнага вучонага савета (ДВС) [2, с. 240].

Другая палова 1920-х гг. характарызавалася таксама развіццём метадаў і форм навучання, сярод якіх атрымалі вядомасць лабараторны, лабараторна-даследчы, наглядна-ілюстрацыйны, экскурсійны метады і такія формы навучання, як дальтан-план, студыйнае і праектнае навучанне. Славесна-дагматычны і славесна-кніжны метады супрацьпастаўляліся інавацыйным як састарэлыя. Такім чынам, змест, структура і метадычныя асновы вучэбных кніг па грамадазнаўстве павінны былі адпавядаць патрабаванням адукацыйнай сістэмы прадмета. Інтэграваны падручнік павінен быў забяспечваць комплекснае навучанне, накіроўваючы школьнікаў пераважна на асэнсаванне рэчаіснасці, практычную дзейнасць па яе вывучэнні [12, с. 114].

Як паказала А. Дзятлава, на этапе 1921—1922 гг. у выкладанні грамадазнаўства педагогі выкарыстоўвалі пераважна дасавецкія кнігі, якія спрабавалі адаптаваць да новых умоў вучэбнай работы [4, с. 121]. У 1923—1926 гг. дыдактычныя патрабаванні да вучэбнай літаратуры прадугледжвалі комплексны змест кніг і магчымасць іх выкарыстання ва ўмовах групавога (брыгаднага лабараторнага) навучання. У 1927—1929 гг. метадычныя патрабаванні да падручнікаў вызначалі інтэгратыўны характар кніг, якія спалучаў тэорыю грамадазнаўчых прадметаў, інфармацыю гаспадарчай і прафесійна-працоўнай накіраванасці з элементамі этыкі, псіхалогіі, літаратуры і выхавання. У 1930—1934 гг.

асноўным тыпам падручніка сталі рабочыя кнігі, тэкставы кампанент якіх ілюстраваў сучаснасць і політэхнічнасць, а пазатэкставы — арыентаваў вучняў на пошукавы, даследчы характар набыцця ведаў, выкарыстанне падручніка ва ўмовах метаду праектаў [4, с. 123].

Пачынаючы з 1922 г., М. Вальфсон штогадова перавыдаваў дапаможнік «Нарысы грамадазнаўства» (1-е выданне — 1922 г., 2—4-я выданні — 1923 г., 5-е выданне — 1924 г.) [3]. Гэта кніга, перакладзеная М. Яворскім, была прыстасавана да праграм украінскіх школ (1-е выданне — 1923 г., 2-е выданне — 1925, 3—4-я выданні — 1926 г., 5-е выданне — 1927 г.). Перакладчык увёў у тэкст падручніка матэрыялы з Канстытуцыі УССР і выклаў асновы нацыянальнай палітыкі савецкай улады ў Украіне. Дапаможнік стаў першым сродкам навучання, у якім вучэбны матэрыял групавалі паводле комплексных праграм: тэксты параграфаў будаваліся на прынцыпе аб'яднання гістарычнага, эканамічнага, прававога і палітычнага матэрыялаў вакол стрыжнёвай праблемнай тэмы і ілюстраваліся фрагментамі з літаратурных твораў. Структура кнігі складалася з 8 нарысаў: «Фактары развіцця чалавечага грамадства», «Кароткі агляд гісторыі першабытнай культуры», «Кароткі агляд гісторыі гаспадарчых форм і сацыяльных адносін», «Структура капіталістычнага грамадства», «Гісторыя сацыялізму і сацыяльных рухаў», «Сацыяльна-рэвалюцыйны рух у Расіі і на Украіне», «Барацьба пралетарскай рэвалюцыі за існаванне і яе перамога», «Арганізацыя савецкай дзяржавы». Кожны нарыс падзяляўся на тэмы, напрыклад «Заняпад Рыма», «Гісторыя сацыялізму», «Канстытуцыя УССР». У дапаможніку аўтар змясціў біяграфічныя звесткі пра вядомых гістарычных дзеячаў, прадметны паказальнік і спіс дадатковай літаратуры. Чорна-белыя ілюстрацыі візуальна дапамагалі асэнсаваць вучэбны матэрыял і дапаўнялі яго.

Падтрымліваем выснову І. Смагіна аб тым, што метадычныя асновы дапаможніка (дыдактычная мэта і задачы, функцыі, змест і структура) адпавядалі патрабаванням комплекснага навучання і пазіцыям вучэбнай праграмы па грамадазнаўстве [12, с. 117].

Пераход на навучанне па комплексных праграмах у Украіне пачаўся ў 1924/1925 навучальным годзе, але частка метадыстаў і навукоўцаў стаяла на пазіцыях навучання грамадазнаўству на аснове праграм 1921 г. У 1924—1925 гг. выйшла грунтоўная 5-томная праца па грамадазнаўстве (аўтары — М. Грацыянскі, Г. Гордан, К. Котрахаў і інш.) пад рэдакцыяй М. Тарасава [17]. Гэты дапаможнік стаў першай сур'ёзнай спробай выразна і цэласна, з матэрыялістычных пазіцый апісаць гістарычнае развіццё Расіі і замежных краін, пачынаючы з найстаражытных часоў і заканчваючы пачаткам XX ст. Вучэбная кніга была створана ў форме зборніка артыкулаў у 5 тамах: т. 1 — «Жыццё грамадства ў першасных формах і складаных фарміраваннях у Егіпце, Месапатаміі, Грэцыі і Рыме»; т. 2 — «Формы арганізацыі працы і грамадства ў эпоху пераважання натуральнай гаспадаркі і развіцця міжземнаморскага гандлю»; т. 3 — «Жыццё грамадства ў эпоху акіянічнага гандлю, зараджэння сусветных рынкаў і капіталізму»; т. 4 — «Жыццё грамадства ў эпоху найноўшага сусветнага гандлю, капіталістычнай прамысловасці і развіцця сацыялізму»; т. 5 — «Капіталізм і сацыялізм: эканамічныя і дзяржаўна-прававыя асновы жыцця грамадства». Стрыжнёвая ідэя, якую аўтары заклалі ў аснову гэтай вучэбнай кнігі, — неабходнасць спалучэння грамадскіх навук з практыкай жыцця. Гэта ідэя адказвала патрабаванням праграмы па прадмеце і па адпаведных метадах вучэбнай працы.

Па змесце дапаможнік, які меў 1422 старонкі, стаў першай удалай спробай асвятлення гістарычнай і грамадазнаўчай інфармацыі на аснове матэрыялістычнага вучэння. Структура кнігі адпавядала патрабаванням комплекснага навучання, а метадычны апарат уключаў пытанні для самакантролю, шрыфтавыя выдзяленні і г. д., у асноўным забяспечваў работу з падручнікам згодна з патрабаваннямі вучэбнай праграмы [12, с. 117].

Дапаможнік М. Вальфсона і 5-томнік М. Тарасава па змесце, структуры і метадычным апараце забяспечвалі рэалізацыю лабараторнага брыгаднага метаду навучання школьнікаў на ўроках грамадазнаўства. Змястоўная і структурная адпаведнасць гэтых кніг патрабаванням комплекснага навучання была адначасова і іх метадычным недахопам, бо будова дапаможнікаў з асобных нарысаў або артыкулаў стварала праблемы ў карыстанні сродкам навучання. Настаўнік павінен быў да кожнага ўрока групаваць вучэбны матэрыял вакол галоўнай ідэі з розных грамадскіх навук і артыкулаў, што ўскладняла карыстанне кнігай і зніжала эфектыўнасць засваення вучэбнага матэрыялу дзецьмі [12, с. 117—118].

На этапе 1923—1925 гг. пачалі ствараццa першыя рабочыя кнігі як разнавіднасць вучэбнай літаратуры для школы II ступені. Рабочая кніга арыентавалася на арганізацыю самастойнай работы вучняў і ўтрымлівала дакументы, дадатковыя матэрыялы, пытанні да вучэбных тэм. Адной з першых такіх кніг стала «Перасоўная лабараторыя па грамадазнаўстве» (Б. Жаваранкаў і С. Дзюбінскі, 1923—1925 гг.) [5]. У яе ўвайшлі больш за 100 артыкулаў розных аўтараў, якія, на думку Л. Бушчыка, часцей займаліся тагачаснымі палітычнымі пытаннямі, чым храналагічнай паслядоўнасцю ў выкладанні падзей дарэвалюцыйнага часу [2, с. 208].

«Перасоўная лабараторыя...» структурна будавалася з парушэннем храналагічнага прынцыпу ў асвятленні грамадскіх падзей. Асноўная метадычная ідэя, якую аўтары закладвалі ў яе змест, — стымуляванне да ўсвядомленага фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі вучняў. Вядучым метадам навучання быў лабараторны, бо метадычны апарат кнігі арыентаваўся на вучэбныя даследаванні і лабараторныя работы. На метадычныя недахопы «Перасоўнай лабараторыі...» звяртаюць увагу Л. Бушчык, А. Памятун, А. Дзятлава, якія вызначаюць перанасычанасць тэксту палітычнымі падзеямі, неабгрунтаванае ўвядзенне складаных сацыялагічных паняццяў, неабходнасць кампанаваць змест кожнага ўрока шляхам адбору з ўсяго вучэбнага матэрыялу кнігі патрэбных фрагментаў і г. д.

А. Гукоўскі і А. Трахтэнберг у 1926 г. распрацавалі дапаможнік «Фазы грамадскага развіцця» [16], які некалькі разоў перавыдаваўся ў канцы 1920-х гг. Структурна дапаможнік складаўся з 4 частак у адпаведнасці з дзяленнем гісторыі чалавецтва на 4 грамадска-палітычныя фармацыі: «Першапачатковая фаза грамадскага развіцця», «Радавое грамадства», «Феадальная супольнасць», «Капіталістычная форма развіцця». Як адзначае А. Дзятлава, вучэбныя тэмы дапаможніка інтэгравалі ў сабе вучэбны матэрыял па гісторыі, сацыялогіі, эканоміцы, этыцы [4, с. 148]. Змест кнігі адпавядаў патрабаванням комплекснага навучання, але яна мела традыцыйныя для вучэбнай літаратуры таго перыяду метадычныя хібы: абстрактнасць зместу вучэбнага матэрыялу, празмернае выкарыстанне складаных тэрмінаў, парушэнне логікі і сістэмнасці, занадта акадэмічная мова [12, с. 118].

У 1927/1928 навучальным годзе пачалося ўвядзенне абавязковых вучэбных планаў і праграм для школ павышанага тыпу [12, с. 118]. На этапе 1927—1929 гг. асноўным тыпам вучэбнай літаратуры па грамадазнаўстве сталі рабочыя кнігі, якія былі выдадзены для 5—7 груп [2, с. 219]. Вучэбны матэрыял структурна падзяляўся на часткі згодна з комплексамі-праектамі, запланаванымі на бягучы год навучання. У гэтых кнігах выкладаўся тэарэтычны, фактычны, ілюстрацыйны матэрыял, вучням былі прапанаваны задачы, пытанні і практыкаванні для самастойнай работы. На старонках кнігі школьнікі маглі знайсці неабходныя спасылкі і спісы літаратуры, а настаўнікі — метадычныя тлумачэнні да заняткаў.

Унутраная будова рабочых кніг адпавядала задачам комплекснага навучання. Спачатку даваўся ўступны артыкул, а затым прапаноўваліся практычныя заданні. Да іх прыкладаліся інструкцыі, даведачны матэрыял, а ў канцы — выніковы артыкул [12, с. 119].

У 1929 г. была выдадзена «Рабочая кніга па грамадазнаўстве для 7-га года навучання» А. Стражава [13]. Створаная па праграме 1927 г., яна складалася з 10 раздзелаў, якія падзяляліся на тэмы. У сваю чаргу, кожная тэма ў форме пункта будавалася наступным чынам: назва тэмы, мэта і задачы вучэбнай работы, план, вучэбны матэрыял, матэрыял для паўтарэння, пералік вучэбных дапаможнікаў і мастацкай літаратуры. Вучэбныя тэксты складаліся па інтэграваным прынцыпе, у іх былі прадстаўлены ілюстрацыі, табліцы, карты, графікі, гістарычныя дакументы. Аўтар дапаможніка ўвёў у тэксты новыя для таго часу паняцці: *фашысцкая ідэалогія, парламентарызм, выбарчае права* і г. д. Структура і метадычны апарат кнігі адпавядалі брыгадна-лабараторнаму метаду навучання і спрыялі развіццю ўменняў самастойнай работы вучняў з матэрыялам. У пачатку 1930-х гг. прадоўжылася выданне вучэбнай літаратуры па грамадазнаўстве з інтэграваным зместам вучэбнага матэрыялу, арыентаванай на пошукавы і даследчы метады навучання. У 1930 г. у Харкаве быў выдадзены падручнік па грамадазнаўстве для 5—7-х гадоў навучання пад рэдакцыяй Д. Скурацкага [14]. Кніга складалася з гістарычных і сацыялагічных нарысаў, аўтарамі якіх былі А. Гарадзецкая («Рэвалюцыя 1905»), І. Гехтман («Развіццё прамысловага капіталізму ў Расіі і Украіне») і інш. Інтэграванасць зместу гэтага падручніка выяўлялася ў спалучэнні вучэбнай інфармацыі

гістарычнага, прававога, эканамічнага характару. Але кніга ўтрымлівала тыповыя метадычныя недахопы ў падручніках па грамадазнаўстве таго часу: складаная мова тэкстаў, абстрактнасць і сацыялагізаванасць у выкладанні матэрыялу, слабая сувязь паміж тэмамі. Найбольш цяжкімі сталі матэрыялы для школьнікаў 7-га года навучання. Яны былі перанасычаны эканамічнымі і сацыялагічнымі паняццямі. А. Дзятлава, аналізуючы матэрыял гэтага падручніка, адзначае храналагічную разарванасць вучэбных тэм па гісторыі, фрагментарнасць у выкладанні фактаў, што перашкаджала фарміраванню ў вучняў цэласнай сістэмы ведаў [4, с. 119].

Падручнік «Грамадазнаўства» для пачатковай і сярэдняй школы (М. Аўсяннікава, Б. Левітан, А. Аляксандраў, С. Ушакоў) у 4 частках быў выдадзены «Советской школой» у 1933 г. [15]. Змест курса ахопліваў 3—6 гады навучання. Падручнік складаўся з 4 асобных частак у адпаведнасці з 4 гадамі навучання, на якія ён быў разлічаны.

У першай частцы падручніка (3-і год навучання) адлюстраваны асноўныя перыяды рэвалюцыйнага руху ў Расіі, перамога рабочага класа ў Кастрычніку, Грамадзянская вайна, роля партыі бальшавікоў з яе правадырамі ў гэты перыяд. Другая частка падручніка (4-ы год навучання) раскрывала сэнс дыктатуры пралетарыяту, знаёміла з асновамі савецкага будаўніцтва, паказвала поспехі ў пабудове сацыялістычнага грамадства, дасягнутыя рабочымі і сялянамі пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў на чале з І. Сталіным. Трэцяя частка падручніка (5-ы год навучання) знаёміла вучняў з жыццём, дзейнасцю і барацьбой К. Маркса, Ф. Энгельса, У. Леніна, І. Сталіна і давала элементарнае ўяўленне пра асновы іх тэорыі. Чацвёртая частка (6-ы год навучання) прапаноўвала глыбокае вывучэнне асноў марксісцка-ленінскага вучэння [12, с. 121]. Змястоўна прапаноўваліся гістарычныя, паліталагічныя і палітэканамічныя веды. Раздзел — асноўны структурны кампанент падручніка — падзяляўся на параграфы. Пытанні для паўтарэння, напрыклад: «Чаму вучылі Маркс і Энгельс?», «Хто працягнуў вучэнне Маркса — Энгельса?», «Хто працягвае вучэнне Маркса — Энгельса — Леніна?», ставіліся ў канцы параграфаў [15, с. 101].

Ідэалагічны напрамак матэрыялаў адказваў трактоўцы грамадскіх працэсаў марксісцка-ленінскай навукі таго часу. У адрозненне ад падручніка Д. Скураціўскай, гэта кніга была напісана зразумелай мовай, без злоўжыванняў складанымі тэрмінамі і абрэвіятурамі. У тэксце ёсць шрыфтавыя выдзяленні, чорна-белыя ілюстрацыі, табліцы. Паколькі падручнікі па грамадазнаўстве адпавядалі прынцыпам праграм ДВС, устаноўленым у іх аб'ёме ведаў і сістэме іх разгортвання, усё гэта непазбежна прыводзіла да тых жа памылак і недахопаў, якія былі ўласцівыя праграмам ДВС у вырашэнні праблемы зместу навучання. У падручніках парушаліся сістэматычнасць і пераемнасць, і, як следства, недаацэньваліся асновы грамадскіх ведаў.

Агульнымі хібамі вучэбных кніг па грамадазнаўстве, на думку І. Смагіна, былі: перавага ў выкладанні матэрыялу абстрактна-сацыялагічнай схемы, празмернае захапленне эканоміка-статыстычным аналізам, мадэрнізацыя гістарычных падзей, штучная падтасоўка фактаў да загадзя ўстаноўленых высноў, парушэнні гісторыка-храналагічнай паслядоўнасці [12, с. 122]. Так, у «Рабочай кнізе па грамадазнаўстве. Гісторыя Захаду і Расеі» для школ II ступені (8—9-я гады навучання), складзенай пад агульнай рэдакцыяй М. Пакроўскага, курс будаваўся не ў храналагічна паслядоўным парадку, а ў сацыялагічным разрэзе. Напрыклад, раздзел рускай гісторыі падзяляўся на 4 часткі: 1. Буржуазны лібералізм і радыкалізм у Расіі. 2. Народніцкая рэвалюцыя. 3. Пралетарская рэвалюцыя. 4. Расійскі імперыялізм [10].

Дыдактычныя хібы вучэбных кніг па грамадазнаўстве 20-х — пачатку 30-х гг. сталі прадметам абмеркавання сярод кіраўнікоў адукацыі, вучоных, метадыстаў і настаўнікаў. На нарадах і канферэнцыях па гэтай праблематыцы быў сфармуляваны шэраг важных метадычных патрабаванняў да падручніка па грамадазнаўстве. Па-першае, выкладанне матэрыялу павінна быць даступным і зразумелым для вучняў пэўнага ўзросту; па-другое, пры напісанні падручніка належыць улічваць інтарэсы дзяцей; па-трэцяе, пераказ варта будаваць на прынцыпах сістэматычнасці і паслядоўнасці. Кожны факт трэба разглядаць у сістэме іншых фактаў, каб у падручніку адчуваўся дыялектычны рух думкі [11, с. 152].

У сярэдзіне 30-х гг. украінская школа паступова страчвае сваю нацыянальную адметнасць. У 1934—1935 гг. была ўведзена агульнасаюзная сістэма народнай адукацыі з уніфікаванымі праграмамі і адзіным для кожнага прадмета стабільным падручнікам, які зацвярджаўся ў Маскве. Вяртанне да прад-

метнага вывучэння матэрыялу і ўкараненне адзінага стабільнага падручніка хоць і мелі пэўныя пазітыўныя вынікі (дапамаглі сістэматызаваць веды і ўменні вучняў, павысіць узровень авалодання імі асновамі навук), на жаль, прыўнеслі ў савецкую школу аднастайнасць і фактычна затармазілі развіццё педагагічнай навукі амаль на 3 дзесяцігоддзі [6, с. 175].

**Высновы.** Тэндэнцыі развіцця вучэбнай літаратуры па грамадазнаўчых дысцыплінах дастаткова поўна адлюстроўвалі асноўныя напрамкі перабудовы зместу і метадаў навучання, якая праходзіла ў гэты перыяд у савецкай школе. Так, на першым этапе (1920—1925), у працэсе пераходу ад прадметнага навучання да комплекснага, пад уплывам палітыка-ідэалагічных і дыдактычных фактараў ствaралася праграма інтэграванага прадмета «Грамадазнаўства», фарміраваліся новыя тыпы падручнікаў. Другі этап (1926—1934) можна назваць этапам станаўлення рабочай кнігі як асноўнага віду вучэбнай літаратуры па грамадазнаўстве, паколькі яна аптымальна адпавядала дыдактычным патрабаванням комплекснага навучання.

Супярэчлівыя, але актыўныя і творчыя пошукі шляхоў збліжэння школы з жыццём, з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, уліку школай значнай меры запытаў грамадства — усе гэтыя рысы і асаблівасці новай савецкай педагогікі знайшлі адлюстраванне ў змесце, структуры і функцыях вучэбнай літаратуры.

Важнае значэнне ў развіцці методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін атрымаў таксама працэс пераўтварэння вучэбнай літаратуры ў сродак камуністычнага выхавання дзяцей.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Борьба за обществоведение и школьная практика последних лет : [сб. статей] / сост.: С. Н. Дзюбинский, Б. Н. Жаворонков. — М. : Мир, 1925. — 164 с.
2. *Бущик, Л. П.* Очерк развития школьного исторического образования в СССР / Л. П. Бущик. — М. : Изд-во АПН РСФСР, 1961. — 537 с.
3. *Вольфсон, М. Б.* Очерки обществоведения / М. Б. Вольфсон. — 2-е доп. и испр. изд. с рис. в тексте. — М.—П. : ГИЗ, 1923. — 428 с.
4. *Дятлова, О. М.* Інтегративний підхід до навчання суспільствознавства в загальноосвітніх школах України (20-ті — 30-ті рр. XX століття): дис. ... канд. пед. наук : 13.00.02 / О. М. Дятлова. — К., 2008. — 221 с.
5. *Жаворонков, Б. Н.* Подвижная лаборатория по обществоведению : учеб. / Б. Н. Жаворонков, С. Н. Дзюбинский. — Л. : ГИЗ, 1923. — Кн. 1. — 130 с.
6. *Жосан, О. Е.* Тенденції розвитку шкільної навчальної літератури в Україні (20-ті — 80-ті роки XX століття) : монографія / О. Е. Жосан. — Кіровоград : Ексклюзив-систем, 2013. — 656 с.
7. Керівництво по соціальному вихованню. — 4-е вид., перер. — Х. : Державидав. України, 1924. — 82 с.
8. *Лисенко, М. М.* Розвиток методики історії та суспільствознавства на Україні за роки Радянської влади / М. М. Лисенко // Методика викладання історії та суспільствознавства : республіканський наук.-метод. збірник. — К. : Рад. школа, 1968. — В. 2. — С. 3—23.
9. *Пометун, О. І.* Проблеми розвитку шкільної історичної освіти в Україні в XX столітті : автореф. дис. ... д-ра пед. наук: 13.00.01; 13.00.02 / О. І. Пометун. — К., 1998. — 51 с.
10. Рабочая книга по обществоведению. История Запада и России: 8—9 годы обучения / С. В. Гингорн, Е. Я. Драбкина, Ф. Ф. Козлов [и др.] — М.—Л. : Госиздат, 1929. — 491 с.
11. *Равкин, З. И.* Советская школа в период восстановления народного хозяйства 1921—1925 гг. / З. И. Равкин. — М. : Госучпедгиз, 1959. — 275 с.
12. *Смагін, І. І.* Методичні засади створення і функціонування підручників із суспільствознавчих предметів у загальноосвітній школі України (1920—1990 рр.) : дис. ... докт. пед. наук: 13.00.02 / І. І. Смагін— К., 2011. — 562 с.
13. *Стражев, А. И.* Рабочая книга по обществоведению для 7-го года обучения / А. И. Стражев. — Л. : Учпедгиз, 1929. — 352 с.
14. Суспільствознавство : підруч. для 5—7 років навч. / Д. Скуратівський та ін.; за ред. Д. Скуратівського. — Х. : ДВУ, 1930. — 186 с.
15. Суспільствознавство : підруч. для початк. та середн. шк.: у 4 ч. / М. Овсяннікова, Б. Левітан, А. Александров, С. Ушаков. — К.—Х. : Рад. школа, 1933. — Ч. 1. — 113 с.
16. *Трахтенберг, О. В.* Фазы общественного развития : учеб. пособие для школ I и II ступ. / О. В. Трахтенберг, А. И. Гуковский. — М.—Л. : Госиздат, 1926. — 210 с.
17. Обществоведение : сб. ст. / сост. Г. О. Гордон ; под ред. проф. Н. Г. Тарасова. — Пг. : Сеятель, 1924. — Т. 4. — XV, 336 с. — (Жизнь общества в эпоху новейшей мировой торговли, капиталистической промышленности и развития социализма).
18. *Ясницький, Г. І.* Розвиток народної освіти на Україні (1921—1932 рр.) / Г. І. Ясницький. — К. : Вид. Київського університету, 1965. — 255 с.